View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Electronic Library Pavel Sukhoi State Technical University of Gomel (GSTU)



# РАДУНІЦА ЯК ХАРАКТЭРНЫ ПРЫКЛАД СІНТЭЗУ ЯЗЫЧНІЦКІХ І ХРЫСЦІЯНСКІХ ЭЛЕМЕНТАЎ У КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

**Канд. гіст. навук, дац. С. А. Юрыс**
*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Беларускаму этнасу ўласцівы цэлы шэраг спецэфічных рыс, якія выцякаюць з месцазнаходжання займаемай ім тэрыторыі, унікальнасці гістарычнага шляху разввіцця, своеасаблівасці духоўна-ментальных структур і архетыпаў свядомасці. Большасць рытуальных дзеянняў дахрысціянскіх культаў на Беларусі, як і ў іншых землях звязана з падтрымкай дыялога «чалавек» – «прырода». Мэтай устанаўліваемай сувязі з'яўляецца спроба чалавека абаперціся на магутныя прыродныя сілы, каб тыя спрыялі вынікам яго працы на зямлі. Аднак не толькі сілы прыроды хацеў схіліць на свой бок чалавек, але і моц і вартасці продкаў. У каляндары старажытнага насельніцтва Беларусі дзен ушанавання памершых было значна больш, чым мы шануем сення. Сярод іх субота перад Масленіцай, першая, другая і трэцяя суботы Вялікага посту, субота перад Тройцай. Найбольш пашыранымі сярод беларусаў былі менавіта Дзяды і Радуніца [1, с. 32].

Старажытныя культы пацясняюцца хрысціянствам, але з культурнай прасторы яны знікаюць не цалкам.У панядзелак Фаміного тыдня (другі тыдзень пасля Пасхі), радзей у аўторак, у Расіі адзначаецца Радуніца. У гэты дзень праходзіць памінанне памерлых на саміх могілках, тут жа налажваецца памінальны стол. У беларусаў Радаўніца адзначаецца, як правіла, ў аўторак пасля вялікоднага тыдня. Панядзелак жа на Фаміным тыдні ў беларусаў называецца Жывая Радуніца. Такая назва за ім замацавалася, можа, таму, што назаўтра, у аўторак, будзе Мертвая Радуніца, людзі будуць успамінаць памерлых продкаў. Беларусы абавязкова адзначаюць Радуніцу ў аўторак, таму што гэта дзевяты дзень пасля Пасхі. Дзень, як і месца падзеі вызначаны дакладна. На дзевяты дзень душа памерлага пакідае месца, дзе прайшло зямное жыццё чалавека. Могілкі ж з'яўляліся не столькі месцам фізічнага захаранення памерлых, колькі рытуальным месцам сустрэчы з імі.

Паходжанне назвы «радуніца» (радаўніца) выводзяць ад розных слоў: ад ведыйскага radanh (ахвяразнаўства), літоўскога rauda (галашэнне), ад агульнаславянскіх слоў «род», «радзіцца» і г. д. Радуніцу прынята лічыць язычніцкім святам усходніх славян. Даследчык В. Дзеружынскі лічыць радуніцу беларускай з'явай на той падставе, што продкі большасці еўрапейскіх народаў, у тым ліку фіна-ўгорскіх плямен, займаючых тэрыторыю Цэнтральнай Расіі, спальвалі памерлых. Хрысціянства, якое ўвяло забарону на крэмацыю, вядома не магло прывесці да развіцця абраднасці Радуніцы. На тэрыторыю Расіі свята пашырылася разам з перасяленнем некалькі дзесяткаў тысяч рамеснікаў з беларускіх зямель у Маскоўскую дзяржаву, куды іх пагналі ў вайну 1654–1667 гг. Звычай харанiць памерлых і наведваць магілы, адзначае Дзеружынскі, зарадзіўся і пашырыўся з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, Мазовіі. Таму, магчыма, тэрмін «Радуніца» паходзіць ад назвы ракі Радунь. Гэту тэрыторыю нашы продкі лічылі «цэнтрам збора ўсопшых душ» [2, с. 156].

Язычніцкае паходжанне Радуніцы не выклікае сумненняў. Першыя пісьмовыя сведкі пра Радуніцу, праўда, не як пра абрад, а як пра каляндарную дату, утрымліваюцца ў Троіцкім летапісе. Распавядая пра нападзенне Літвы на Пераяслаўль у 1372 г., летапісец адзначае, што яно адбылося пасля Вялікдня на другім тыдні, у аўторак, па Радуніцы.

Чацверг святога тыдня ў некаторых мясцінах Беларусі называецца «наўскім» – дадзены тэрмін азначае пакойнікаў і ўвогулле духаў , або «вялікаднем мертвых». Так, у

Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1092 г. распавядаецца, як бесы ўязвлялі людей «и человеци глаголаху: яко навье бьють полочаны» [3, с. 179].

Пасля заўпакойнай літургіі ці паніхіды ў царкве родзічаў памінալі на могілках. Прыбіралі магілы блізкіх, рассцілалі абрусы для памінальнай трапезы, прычым запрашалі на пачастунак і пакойных родзічаў: «Святыя радзіцелі, хадзіце, хадзіце к нам есці, што Бог даў!».

Пасля гэтага усе «хрыстасаваліся з памерлымі». Гаспадыня асвячоным яйкам праводзіла на магіле крэст, пасля яйка ачышчалі. Шкарлупкі клалі на магілу, а яйка дзялілі на ўсіх прысутных, як сімвал новага жыцця. Калі ж паміж сустракаемым і мінулагоднім Вялікаднем у сям'і здаралася гора – паміраў нехта з суродзічаў першага калена сваяцтва, то яйкі ў чырвоны колер не фарбавалі. Іх проста варылі і пакідалі белымі або распісвалі фарбамі сіняга, чорнага, або зяленага колеру [1, с. 67]. Прыблізна адна трэць чаркі гарэлкі адлівалася на магілу, кожным з прысутных, па чарзе, у парадку атрымання чаркі. Калі чарка абыходзіла ўсіх, астатак з яе зноў-такі вылівалі на магілу – атрымоўваўся замкнены круг, што сімвалізавала аб'яднанне рода вакол продкаў. Такі звычай адзначае і вядомы беларускі этнограф, шырока выкарыстоўваемы ў XIX ст., А. Я. Багдановіч. «В этот день хозяйки обязательно пекут грибки, то есть толстые блины из пшеничной муки, на масле и яйцах; запасаются водкой; к этому прибавляются куличи, яйца, сыр, масло и другие остатки пасхальных яств. Все это, завязанное в скатерть, несут на кладбище; там покрывают скатертью могилу, которая к этому дню приводится в порядок, и расставляют на ней принесенное. Что не съедят, оставляют на могиле; на нее же льют водку, если покойник любил выпить, сыплют табак, если он был курильщик или нюхальщик» [4, с. 46]. Мэта дадзенай дзеі была менавіта накарміць продкаў, а не проста адзначыць адзін з дзен памінавення і ўспамінаў памерлых. Не можна было і чапаць зямлю пасля таго, як яна заснула на зіму, гэта значыць ад пакравоў (14.10) і да Радуніцы. У гэты час тасама не трэба было налажваць вялікія святы на свежым паветры, на зямлі, асноўныя святочныя мерапрыемствы пераносяцца ў хату. Пасля ж Радуніцы, заручэння дапамогай ад продкаў, ад рода, можна і пачынаць новы сельскагаспадарчы цыкл. Такім чынам, у Радуніцы выдяляюцца дзве розных дзеі. Гэта язычніцкая трызна, якая спалучаецца з хрысціянскім памінавеннем.

Рэспубліка Беларусь адзіная ў свеце краіна, дзе Радуніца афіцыйна абвешчана святочным днем. Святкаванне Радуніцы і ў сучаснасці застаецца адной з асноўных традыцый жыхароў Беларусі. Напрыклад, у гэты дзень у 2008 г. могілкі навясціла больш 1,6 млн чалавек, што з'яўляцца вельмі значным паказчыкам для краіны з насельніцтвам каля 9,8 млн.

Парушэнне старога культа звязана з прыходам новай рэлігіі. Ломка язычніцкага культу азначае замену асноўных ідэй ўспрымання і асэнсавання навакольнага свету новымі ідэямі. Пераасэнсаваныя новым веравучэннем рэшткі культа, працягваюць існаваць, тым ці іншым чынам увайшоўшы ў культавыя дзеі новай рэлігіі. Выжыванне элементаў язычніцтва ў культурнай прасторы беларусаў стала магчымым таму, што яно несе ў сябе архетыпічныя уяўленні беларускага этнасу. Менавіта архетыпічныя ўяўленні з'яўляюцца той асновай, якая надае спецыфіку нацыянальным каштоўнасцям.

Літаратура

1. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск, 2003.
2. Деружинский, В. В. Тайны белорусской истории / В. В. Деружинский. – Минск, 2010.
3. Карский, Е. Ф. Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Минск, 2007. – Т. 3.
4. Богданович, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : этнограф. очерк / А. Е. Богданович. – М., 2009.